УДК 821.161.3.09+821.162.1.09

**Чмарава Марына Іванаўна**
дацэнт кафедры славянскай філалогіі ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

# АДЛЮСТРАВАННЕ ВОБРАЗА РАДЗІМЫ ПРАЗ МАСТАЦКІЯ СІМВАЛЫ І АРХЕТЫПЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ПАЭТАЎ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

У артыкуле даследуецца адлюстраванне і інтэрпрэтацыя вобраза Радзімы праз мастацкія сімвалы і архетыпы ў творчасці паэтаў Беларусі XIX стагоддзя (Я. Чачота, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча).

Патрыятычныя матывы былі асабліва характэрныя і для літаратуры Беларусі XIX стагоддзя (славянскіх літаратур наогул), калі яна выступала як адзін са спосабаў захавання і самавыражэння беларускага этнасу. Таму натуральна, што пісьменнікі імкнуліся выхаваць у свайго народа патрыятычныя пачуцці: любоў да роднай зямлі, павагу да гістарычнага мінулага свайго краю. Ажыццяўлялі гэтае сваё імкненне беларускія аўтары з дапамогай разнастайных вобразаў, уяўленняў аб Радзіме, праз мастацкія сімвалы і асацыятыўныя глыбіні аўтарскай думкі. У кожнага пісьменніка сфарміраваўся свой асабісты вобраз Радзімы, пабудаваны на пэўных асацыяцыях. Успрыняцце пэўнай часткі радзімы як яе цэлага залежыць ад таго, дзе нарадзіўся, гадаваўся, вучыўся той ці іншы аўтар, ад таго, што пакінула непаўторныя ўражанні, дапамагала развіццю таленту. Нягледзячы на сваё непаўторнае бачанне Радзімы, у творчасці кожнага з разглядаемых пісьменнікаў вобразы роднай зямлі пэўным чынам перагукаюцца, судакранаюцца і развіваюцца і залежнасці ад творчай манеры кожнага аўтара. Можна гаварыць пра пэўную ўсталяванасць, традыцыйнасць у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адлюстраванні вобраза Маці – Радзімы, ужыванне ў яго дачыненні фальклорных сімвалаў і архетыпаў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі 19 стагоддзя. Таму з упэўненасцю можна адзначыць, што творцы чэрпалі свае сілы ад Маці-Зямлі і спрадвечнай народнай культуры. Свет жывой прыроды раскрываецца ў творах майстроў слова Беларусі з пазіцый патрэб перш за ўсё вясковага чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці.

Мэтазгодна пачаць з вобраза Селяніна, бо, несумненна, ён і яго праца заўсёды былі галоўнай крыніцай існавання Радзімы і яе жыхароў. Так успрымалі селяніна вышэйшыя слаі насельніцтва, тым часам як беларускія аўтары лучылі вобраз беларускага мужыка з вобразам Радзімы. Яскравым прыкладам тут можа служыць і творчасць Я. Лучыны. Мужык у Лучыны – чалавек духоўны, маральныя пошукі яго шматкірункавыя. Нельга не заўважыць, што характарыстыка вобраза селяніна ў Лучыны поўнасцю супадае з нашым уяўленнем пра Беларусь – дужая, вынослівая, ціхая краіна, што шукае свой шлях у будучыню. Для сялян Лучыны Радзіма – гэта яны самі, іх зямля, а ўсё астатняе – гэта замежжа. Дарэчы, гэта падцвярджаецца старажытнымі каштоўнаснымі арыентацыямі славян: правае – левае, маё – чужое, дабро – зло і г.д., што рэгламентавалі іх жыццёвыя пазіцыі і сістэму светабачання. Вельмі падобны на лучынаўскага героя і селянін Ф. Багушэвіча, які паказаны чалавекам, моцна знітаваным з Радзімай, адданым ёй, гэтым ён супрацьстаіць беларускім нацыянальным вярхам – панам. Так, у вершы "Ахвяра" створаны своеасаблівы маральны кодэкс беларускага селяніна, які адчувае сябе сынам роднай зямлі, які павінен жыць так, «каб за край быў умерці гатоў", "каб не прагнуў айчызны чужых", "каб я Бога свайго не акпіў", "каб не здрадзіў за грошы свой люд". З вялікай пашанай адносіўся да беларускага селяніна і А. Міцкевіч. У А. Міцкевіча быў своеасаблівы погляд на ролю сялян у развіцці грамадства і ўсёй дзяржавы. Селянін – беларус у творах А. Міцкевіча першай паловы 1820-х гадоў – духоўны арыенцір адраджэння грамадства. У творчасці Я. Чачота, як і ў творчасці У Сыракомлі і Ф. Багушэвіча, праявілася ідэя аб супрацьстаянні "мужыцкай праўды" і панскага крывадушша. Але што ёсць селянін без Зямлі, на якой ён працуе? У Я. Лучыны, напрыклад, селянін нават не належыць сам сабе, бо навекі паяднаны з зямлёй, і, "нібы немаўлятка без маці не ўяўляе сябе без яе. Вобраз зямлі-карміцелькі ўяўляецца беларускім аўтарам як вечны сімвал адраджэння, абнаўлення. Менавіта гэтага жадалі тагачасныя пісьменнікі і для сваёй Радзімы. Гэткая ж ідэя характэрна і для беларускамоўнага верша У Сыракомлі "Добрыя весці", у якім гучыць аўтарская вера ў моц і невычэрпныя багацці роднай зямлі. Маці-зямліца ўвасабляецца ў творчасці паэтаў XIX стагоддзя не толькі як карміцелька, але



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і як родная старонка. Нездарма ў аўтараў літаратуры Беларусі з'яўляецца ўспрыняцце Радзімы як святога краю, што з'яўляецца ўвасабленнем культу роднай зямлі, яе максімальнай сакралізаванасці. Так, напрыклад, родная зямля здольная выратаваць у самыя складаныя моманты жыцця, аб чым гаворыцца ў вершы Ф. Багушэвіча "Свая зямля". Але, вяртаючыся да вобразаў селяніна і зямлі, якая з'яўляецца ўвасабленнем адраджэння і аднаўлення, трэба ўзгадаць і сімвал Хлебу. У творчасці Я. Лучыны селянін, зямля і хлеб з'яўляюцца трыадзінай асновай, на якой трымаецца свет, апафеоз працы і ўслаўленне творцы ў сістэме "хлеб – зямля – селянін" уяўляюць сабою аптымістычную канцэпцыю сапраўднасці. Сакральнае значэнне хлеба Я. Лучына падкрэслівае, называючы яго дарам Божым. Не быў чужды да гэтага сімвалу і У. Сыракомля, які, чуючы пах хлеба, адразу ўспамінае родныя мясціны ("Акраец хлеба"). У кантэксце дадзенага твора сакралізацыя сімвала хлеба таксама адбываецца як праз далучэнне яго да Боскага дару. Элементамі вобразу Маці – Зямліцы выступаюць вобразы маладой Руні, Поля, Нівы, якія, калі разглядаць шырэй, адлюстроўваюць непасрэдна вобраз Маці – Радзімы. Вельмі яскрава распрацаваны гэтыя вобразы ў паэзіі Я. Лучыны. Яны сімвалізуюць само жыццё, яго вечнасць, цыклічнасць. Але ў лірыцы паэта вобразы гэтыя сумныя. Аўтар вельмі балюча перажывае стан роднай зямлі. Тое, што раней радавала яго вока, цяпер толькі засмучае.

Нацыянальная прырода ў шырокім сэнсе ёсць той нацыянальны Космас, які вызначае самабытнасць мыслення і псіхікі ўсялякага этнасу. Таму натуральна, што пейзажныя творы ёсць у арсенале любога нацыянальнага мастака. Не з'яўляюцца выключэннем і разглядаемыя аўтары. У вершах Я. Лучыны адчуваецца захапленне чарамі наваколля, як сумную, так і радасную песню прыроды. Што датычыцца Ф. Багушэвіча, то і гэтаму майстру слова любыя родныя мясціны, але пейзаж іх часам настолькі сумны, што можна адчуць самотную, тужлівую песню прыроды ("Шумяць сосны").

Творчасць У. Сыракомлі не шчодрая на пейзажныя замалёўкі. Больш таго, узнаўляючы карціны роднай прыроды, ён скупіўся на выяўленчыя сродкі. Паэт далёкі ад яе ўсхвалення, але ганарыцца адвечнай прастатой сваёй зямлі. У творчасці А. Міцкевіча і асабліва ў яго паэме "Пан Тадэвуш", у якой ўзнаўленне знаёмых з дзяцінства малюнкаў вясковага жыцця і захопленае апісанне прынавагрудскіх краявідаў стварала ілюзію вандроўкі на радзіму, вяртала да духоўнага здароўя, лучнасці з роднай зямлёй. Вобразы і карціны апісання прыроды ў паэме вучаць патрыятызму і святым адносінам да роднай зямлі. І шчырая рэакцыя абурэння галоўнага героя паэмы з прычыны таго, што яго суразмоўцы аддаюць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

перавагу замежным краявідам і нязвыклым назвам дрэў перад роднай прыродай. Пры ўзнаўленні вобразаў роднага краю А. Міцкевіч імкнецца да гармоніі. Не проста ўспрынятае, а занатаванае і душой адчутае харaство радзімы лучыць паэта з астатнім светам. Менавіта радзіма адкрывае шлях у вышэйшыя сферы. Менавіта радзіма як спазнаная і любая частка сусвету дае магчымасць улавіць адзінства ўсеагульнасціі вышэйшасць злітнасці зямлі з небам. Грунтоўна даследаваны ўплыў на творчасць пісьменніка міфалагічных, язычніцкіх матываў, што выдатна прасочваецца і пры апісанні лесу, дрэў – волатаў, якія з’яўляюцца абагульненым увасабленнем народнай моцы, мудрасці, незнішчальнасці роднай Бацькаўшчыны. Літоўскі лес Міцкевіча перш за ўсё здзіўляе сваёй магутнасцю. Апісваючы лясную дзяржаву, аўтар хацеў падкрэсліць першабытную чысціню літоўскіх лясоў. Апісанні магутных векавых лясоў выразна сімвалізуюць стойкасць, нязломнасць народа, на зямлі якога яны растуць. Сакралізацыя радзімы і беларускай паэзіі XIX стагоддзя актыўна адбываецца і праз апяванне воднай стыхіі, а канкрэтна – рэк і азёр. Гэта тэндэнцыя прасочваецца ў творчасці ўсіх раней узгаданых паэтаў. З патрыятызмам У. Сыракомлі, які мае “лакальны” характар,  параўноўваем з больш маштабны патрыятызм Ф. Багушэвіча, у якога з беларускай хатай асацыіруецца ўся Беларусь (“Мая хата”). Для лірычнага героя з верша старая непрыгожая будыніна – увасабленне Айчыны, усвядомленае выяўленне нацыянальнай ідэі. У дадзеным творы таксама прасочваецца апазіцыя “наша” Радзіма – “чужая” Радзіма, але ў больш маштабным плане – ў дачыненні да ўсёй Радзімы, а не пэўнай яе часткі. Блізкае ўспрыняцце Радзімы выяўляецца і ў творчасці Я. Лучыны. Некаторыя паэты падыйшлі да больш узбуйненага паказа вобраза сялянскай хаты. І зрабілі яны гэта праз адлюстраванне беларускай вёскі, якая таксама сімвалізуе Радзіму. Варта ўзгадаць яшчэ адзін традыцыйны вобраз, які ўвасабляе Радзіму. Гэта вобраз каханай дзяўчыны. Найбольш актыўна ў сваёй творчасці яго выкарыстоўвалі Я. Чачот і А. Міцкевіч. Аўтары сцвярджалі прынцып ахвярнага служэння Радзіме, дзе кожны сімвалічна з’яўляецца яе каханкам.

Такім чынам, у творчасці пісьменнікаў Беларусі XIX стагоддзя вобраз Радзімы праяўляецца даволі багата і шматпланава, што назіраецца ў выкарыстанні імі традыцыйных фальклорных і міфалагічных вобразаў і сімвалаў. Гэтыя вобразы і сімвалы ёсць у творчасці кожнага з разгледжаных вышэй паэтаў. Але, выкарыстоўваючы і ўзбагачаючы фальклорныя вобразы, яны імкнуліся ўзняць іх да ўзроўню агульнанацыянальнага і нават агульначалавечага .



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова